Гарадоцкім, Дзвінскім, Дрысенскім і Лепельскім паветах, складаючы ў 1885 г. 2704 справы, а ў 1895 г. –12 817[1]. Пры абмеркаванні ў 1898 г. умоў распаўсюджання закона 1889 г. аб земскіх начальніках на заходнія губерні міністр унутраных спраў адзначыў, што ў гэты час пасада другога неадменнага члена захавалася ў 8 з 11 павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей Віцебскай губерні і ў 8 з 9 – Мінскай губерні[2].

Пры гэтым дзейнасць неадменных членаў павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей ужо ў канцы 70-х гг. XIX ст. паказала практычныя недахопы. Так, член Мінскай прысутнасці А. Міхельсон адзначаў, што неадменныя члены мелі толькі права кантролю над валасным і сельскім начальствам і таму былі не ў стане ажыццяўляць кантроль над жыхарамі ўсёй тэрыторыі павета[3]. Пры гэтым неадменны член не меў права асабіста ні разбіраць спрэчкі паміж сялянамі, ні судзіць вінаватага. Пры разборы спрэчак і скаргаў па нязначных учынках неадменны член накіроўваў справу ў валасны суд, скаргі на валасны суд – у павятовую прысутнасць ці судовыя ўстановы. Неадменны член назіраў толькі за правільнасцю справаводства валасных праўленняў там, дзе не было закончана пазямельнае ўладкаванне, і ў спрэчках адносна зямлі садзейнічаў заключэнню дабрачынных пагадненняў[4].

## 4.3. Земскія начальнікі

*(С. А. Талмачова)*

Неабходнасць змянення такога становішча была ўсвядомлена ўрадам яшчэ ў 1880 г., калі ў сувязі з узнятым пытаннем пачаліся сенатарскія рэвізіі. У лістападзе 1881 г. была створана спецыяльная камісія (Каханаўская камісія) пад старшынствам члена Дзяржаўнага савета М. Каханава. Яна была закрыта ў маі 1885 г. яшчэ да заканчэння ўскладзенай на яе справы, а далейшая распрацоўка пытання аб рэфарміраванні мясцовага кіравання была перададзена Міністэрству ўнутраных спраў. У выніку 12 ліпеня 1889 г. быў падпісаны закон аб **земскіх начальніках**, які значна змяніў

[1] РДГА. – Ф. 1291. Воп. 38. Спр. 2. Арк. 5–5 зв.
[2] РДГА. – Ф. 1291. Воп. 54. Спр. 229. Арк. 2–4.
[3] НГАБ. – Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 3345.
[4] НГАБ. – Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 61. Арк. 99–101.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

структуру органаў мясцовага кіравання ў адносінах да сельскага насельніцтва[1]. На тэрыторыі Заходняга краю «Положение о земских участковых начальниках» не ўводзілася па палітычных абставінах[2]. Толькі па законе ад 12 чэрвеня 1900 г. інстытут земскіх начальнікаў з 1901 г. быў распаўсюджаны на Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую губерні, а па законе ад 8 чэрвеня 1903 г. і на Гродзенскую, Віленскую і Ковенскую[3]. У руках земскіх начальнікаў была сканцэнтравана адміністрацыйная і судовая ўлада над усім насельніцтвам участка і органамі сялянскага самакіравання. Саслоўныя ж правы сялян былі яшчэ больш абмежаваны[4].

У адпаведнасці з законам 12 ліпеня 1889 г., пры прызначэнні на пасаду земскіх начальнікаў існаваў нармальны і экстраардынарны парадак. Па апошняму яны прызначаліся міністрам ўнутраных спраў. Пры нармальным парадку існавалі дзве катэгорыі кандыдатаў на гэта званне. Агульнымі ўмовамі для абедзвюх катэгорый быў узрост – звыш за  25 гадоў і прыналежнасць да мясцовага спадчыннага дваранства. Пры гэтым у першую катэгорыю ўваходзілі: 1) асобы, якія праслужылі ў губерні не менш за тры гады на пасадзе прадвадзіцеля дваранства (да іх не прад'яўляўся ніякі маёмасны цэнз); 2) дваране з вышэйшай адукацыяй, ці асобы, якія праслужылі ў губерні не менш трох год на пасадзе міравога пасрэдніка, міравога суддзі ці неадменнага члена сялянскай прысутнасці. Пры гэтым яны самі ці іх жонкі ў межах павета валодалі не менш паловай колькасці зямлі, неабходнай для ўдзелу ў выбранні гласных ў павятовы земскі сход, ці іншай нерухомай маёмасцю на суму больш за 7500 руб.

Другую катэгорыю кандыдатаў на пасаду земскага начальніка складалі: 1) асобы з параўнальна вялікім (падвоеным) маёмасным цэнзам і параўнальна нізкім адукацыйным цэнзам (сярэдняя

---

[1] ПСЗРИ. Собр. 3-е. – Т. 9 (1889). – № 6196.– С. 508–535.

[2] Талмачова, С. А. Увядзенне закона аб земскіх начальніках у Беларусі / С. А. Талмачова // Весці БДПУ. Сер. 2. – 2013. – № 4. – С. 11–15.

[3] ПСЗРИ. Собр. 3-е. – Т. 20 (1900). – Отд. 1. – № 18854.– С. 762–764; Т. 23 (1903). – Отд. 1. – № 23106. – С. 687–689.

[4] Панюціч В. П. Земскі ўчастковы начальнік // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1998. – Т. 7. Застаўка–Кантата. – С. 60; Кіштымаў А. Рэформы дзяржаўных інстытутаў і мясцовага кіравання. Контррэформы // Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2005. – Т.  4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX с.). – С. 177.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ